**Буняк Я.Я.,** студ. гр. 311а БДУКМ
Навук. кір. – Гулак А.А.,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# МАТЫВЫ КАНТАКТУ СА ЗВЫШНАТУРАЛЬНЫМ У СЮЖЭТАХ БЫЛІЧКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да нашага часу дайшло шмат узораў фальклору, у якіх апісваюцца моманты кантакту чалавека са звышнатуральным. Уяўляюць цікавасць тэксты былічак, бо менавіта яны даносяць да нас каштоўную міфалагічную інфармацыю. Разгледзім адзін з прыкладаў былічкі, запісаны ад Владыка Надзеі Лук'янаўны (1920 г.н.) у в. Шепелевічы Круглянскага р-на Магілёўскай вобл.

*Жанчына з-за Лосся ішла ў Шэпялевічы і з малым у цэркаў. А па дарозе сустрэла русалак. Яны на бярозе гутаталіся. (Гэта бываець на граной нядзелі. Толькі пасля троіцы). Яна гаворыць: «Здраствуйце». А яны гавораць: «Хадзі к нам гутатацца». Яна: «Гутатайцеся на здароўе». Яны: «Мы б цябе пагутаталі, каб не малое дзіця»* [10].

Прыведзены тэкст цікавы тым, што ў ім адлюстраваны адзін з аспектаў семантыкі дэманічных істот – *Русалак*. Спачатку адзначым, што наогул Русалкі – гэта дэманічныя істоты жаночага роду, якія лакалізуюцца ў вадзе, а таксама ў вясновай зеляніне Русалкі узнікаюць у выніку пераўтарэнняў маладых тапельніц-самазабойцаў, дзяцей, праклятых яшчэ ў мацярынскім улонні, немаўлят, што нарадзіліся мёртвымі, ці загубленнымі адразу пасля нараджэння [9, с. 409]. У сюжэце былічкі адлюстравана шкадаванне *Русалкамі* чалавека, дакладней – маладой маці. Гэта вельмі цікавы аспект семантыкі гэтых дэманічных істот: *Русалкі* – дзяўчыны, якія не зведалі ў жыцці шчасця мацярынства. Пры сустрэчы з жанчынай, яны не зрабілі ёй шкоды, бо з ёй было малое дзіця.

Цікавым таксама з’яўляецца дзеяслоў *гутатацца*, што паўтараецца інфарматарам чатыры разы. Відавочна, гэта гукавая характарыстыка Русалак, якая ў памяці інфарматара вельмі добра захавалася.

Разгледзім наступны прыклад запісаны ад Няхай Маланні Зіноўеўны (1927 г. н.) у в. Падвалотка Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.

Маладая дзяўчына занядужыла і ішла да лекара: «*Дарога была вузенькая, калясная. На сярэдзіне шляху дарогу перасякае ручэй. Завецца гэта месца Перамежжам. Гарадзішча. … Так і хочацца прысесці, здаецца, перевесці дух. Але баюся: як сяду, дык і не ўстану. Раптам чую: нехта едзе ззаду, грымяць колы па карэнні. Я саступіла з дарогі. Бачу: коціць карэта, запрэжанная парай белых коней. А ў ёй кучар і маладая прыгожая жанчына, разадзетая. Падкацілі і сталі, як укапаныя, каля мяне: «Садзіся, падвязу». Я ўжо памкнулася сесці ў карэту, але нехта мне шэпча на вуха: «Не садзіся дзяўчына: блага будзе». Я хуценька адскочыла ад карэты. І тут убачыла, як змяніўся твар у гэтай жанчыны, як злосна заблішчэлі вочы. Яна дзіка зарагатала, карэта рванула з месца, уздыбіліся коні, пачуўся шум, трэск у лесе. А да мяне данёсся голас той жанчыны: «Ага, здагадалася. Я ж Смерць твая, па цябе прыязджала. Раз так, то жыві». Я ўсё думаю апошнім часам: прыгожая яна, мая смерць. Цяпер баяцца яе не буду*» [10].

Нягледзячы на тое, што гэты тэкст мае элементы «мастацкай апрацоўкі», у ім захаліся асноўныя, адметныя рысы былічкі. Вельмі распаўсюджаны сюжэт, пра сустрэчу чалавека са *Смерцю*. *Смерць* у міфалогіі ўсходніх славян – міфічная істота, якая з’яўляецца да людзей з мэтаю прадказання хуткага набліжэння іх канчыны. *Смерць* з’яўляецца шматаблічным вобразам страшнай істоты, залежна ад асаблівасцяў лакальных уяўленняў [4, с. 450]. У. Васілевіч у энцыклапедыі «Міфалогія беларусаў» дае такія апісанні аблічча смерці, сярод якіх няма ўказання на яе хараство. Аднак матыў «прыгожай смерці» рэдка, але сутракаецца ў фальклорна-этнаграфічных матэрыялах. Напрыклад, у працы М. Федароўскага «Люд беларускі» (1897).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходна, таксама звярнуць ўвагу на месца сустрэчы чалавека са звышнатуральным – *Перамежжа*. У назве выразна праглядаецца корань *мяжа*. Мяжа ў міфапаэтычнай карціне свету ўвасабляе дзейсны канал камунікацыі з іншасветам і рубеж паміж гэтым і тым светам. Паводле народных уяўленняў, менавіта па мяжы прыходзяць у свет людзей прадстаўнікі іншасвету. Яна – адзін з цэнтральных канцэптаў міфалагічнага мыслення [3, с. 322].

Узгадваецца, што гэта сустрэча адбываецца пры пераходзе праз *ручай*. Ручай і рака ва ўяўленнях белаусаў звязана са светам памерлых, дзе яны выступаюць альбо як дарога «мяжа» з іншасветам, альбо як дарога туды [6, с. 398]. У гэтым выпадку дарогу перасякае ручай, улічваючы што дзяўчына была хворай – гэтыя сімвалы пераплятаюцца, быццам бы свет мертвых адразае інфарматара ад жыццёвай прасторы.

Наступная былічка запісана ад таго ж інфарматара: Няхай Маланні Зіноўеўны (1927 г. н.) у в. Падвалотка Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.

*А вось што было з маім чалавекам. Ён сам быў Бушавіч. Ведама – малады, дык бегаў да дзяўчат. У яго была дзяўчына па другой вуліцы, за ракой. Заседжваліся доўга, бывала, за поўнач. І вось ідзе аднойчы вясёлы дамоў. А ісці трэбала па плаціне ля млына. І ўспомнілася яму, што ў млыне водзяцца чэрці . Раптам перад ім паказаўся чорны парсюк. І ўсё хоча перашкодзіць ісці, круціцца перад нагамі. Так правёў да самага дому і нямаведама куды знік. Хлопец ведаў, што на іх вуліцы ні ў кога чорных свіней не было. Такое здарэнне было і на другую ноч. А на трэці раз ён узяў з сабою добры дрын. Схаваў недалёка ад месца сустрэчы з дзяўчынай. Ля млына зноў хлопца сустрэў чорны парсюк. Хлопец не чапая яго амаль да самага дома. Пасмялеў парсюк і круціцца ля самых ног. Злаўчыўся гэта хлопец ды так аперазаў яго, што ённе піскнуў, а раўнуў неяк дзіка і рассыпаўся іскрамі. З тых пор яго ўжо не праводзіў парсюк. Але хутка развітаўся і з тою дзяўчынай, бо яе маці, казалі, ведзьма і не хацела, каб гэты батрак хадзіў за яе дачкой. Вось яна і падаслала чорта* [10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звернем увагу на тое, што чорт прыйшоў да хлопца ў выглядзе «чорнага парсюка». Чорт у беларускай міфалогіі – ліхі дух, які шкодзіць толькі чалавеку [7, с. 519]. Ч. Пяткевіч у сваей кнізе «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся: этнаграфічныя матэрыялы» (1932) піша: «Чорт у сваім звычайным вобліку рэдка паказваецца… Ен часта ператвараецца ў жывел і нежывыя прадметы. Да абраных ім жывёл належаць: чорны казел, баран і кот; з птушак: певень, сава і няясыць; радзей ператвараецца ў іншую істоту. Прасоўваецца наперад перад тым , хто едзе ці ідзе пешшу» [8, с. 181].

Поўнач – найбольш сакралізаваны адрэзак часу, які асэнсоўваецца як свайго роду «антычас». Ён максімальна адкрыты пранікненню ўсіх магчымых праяў іншасвету, перыяд актывізацыі вясковых чараўніц і ведзьмаў. Як межавы час, *поўнач* найбольш спрыяльная для кантактаў з тагасветнай прасторай і яе прадстаўнікамі, што асабліва наглядна ў магічных дзеяннях «чорнай» магіі. Каля старога млына ў поўнач да першых пеўняў збіраюцца і скачуць чэрці [1, с. 368].

Месца сустрэчы са звышнатуральнай істотай таксама выражае сакрыльны сэнс. *Млын* – пабудова для размолу зерня. З вадзяным і з ветраным млынам звязваецца шэраг павер’яў. Лічылася, што млынары маюць стасункі з нячыстай сілай. У чарадзейных казках падрэсліваецца, што ў млыне ўдзень малолі людзі, а ўначы – чэрці. Млынары ўважаліся за вельмі моцных чараўнкоў [5, с. 308]. Тое, што маці дзяўчыны лічылі ведзьмай, сведчыць, што ёй прыпісваліся шкодаsuccessfully магічныя практыкі. У прыватнасці, адваротная любоўная магія.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што міфалогія добра захавалася менавіта ў тых народных творах, у якіх прысутнічае матыў кантакту з іншасветам. На мой погляд падобныя матэрыялы маюць цікавасць у навуковым сэнсе. Яны даносяць архаічныя ўяўленні славян не толькі пра асобныя персаніфікаваныя праяўленні нячыстай сілы, але і пра міфалагічны светапогляд у цэлым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Валодзіна, Т. Поўнач / Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / Т. Валодзіна, У. Лобач [і інш.]; навук. рэд. Т. Валодзіна. – Мінск, 2011. – С. 368.

2. Виноградова, Л. // Народная демонология и мифоритуальная традиция славян / Л.Н. Виноградова. – Москва : Индрик, 2000. – 432 с.

3. Вуглік, І. Мяжа / І. Вуглік // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / Т. Валодзіна, У. Лобач [і інш.]; навук. рэд. Т. Валодзіна. – Мінск, 2011. – С. 322–323.

4. Вуглік, І. Смерць / І. Вуглік // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / Т. Валодзіна, У. Лобач [і інш.]; навук. рэд. Т. Валодзіна. – Мінск, 2011. – С. 450.

5. Дучыц, Л. Млын / Л. Дучыц, С. Санько // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / Т. Валодзіна, У. Лобач [і інш.]; навук. рэд. Т. Валодзіна. – Мінск, 2011. – С. 308.

6. Дучыц, Л. Рака / Л. Дучыц // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / Т. Валодзіна, У. Лобач [і інш.]; навук. рэд. Т. Валодзіна. – Мінск, 2011. – С. 398 – 399.

7. Лобач, У. Чорт / У. Лобач // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / Т. Валодзіна, У. Лобач [і інш.]; навук. рэд. Т. Валодзіна. – Мінск, 2011. – С. 519 – 520.

8. Pietkiewich, Cz. // Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego : Materialy etnograficzne. – Warszawa, 1938. – S. 181–182.

9. Сівіцкі, У. Русалка / У. Сівіцкі // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / Т. Валодзіна, У. Лобач [і інш.]; навук. рэд. Т. Валодзіна. – Мінск, 2011. – С. 409.

10. Фальклорная калекцыя. Філіял ІМЭФ ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі». – Фонд 13. – Воп. 11. – Спр. 74. Няказачная проза. Легенды. 1990–2000 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ